**К.У.Міхайлава,**
*суіскальнік кафедры бібліятэказнаўства*

# БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ АДУКАВАНАСЦЬ ЯК ЧАСТКА ІНФАРМАЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ СТУДЭНЦТВА

Павелічэнне колькасці інфармацыі, інтэнсіўнае развіццё інфармацыйных сістэм і ўскладненне інфармацыйных тэхналогій знаходзяцца ў поўнай супярэчнасці з магчымасцямі асобнага індывіда па іх асваенні. Нейтралізацыя негатыўных вынікаў гэтай супярэчнасці, яе аптымальнае вырашэнне ў значнай меры залежаць ад узроўню культуры спажывання інфармацыі, якая з'яўляецца неад'емнай часткай агульнай культуры чалавека інфармацыйнага грамадства.

Вышэйшая адукацыя і інфармацыйная культура цесна ўзаемазвязаны. Асновы інфармацыйнай пісьменнасці — сукупнасць ведаў, уменняў, навыкаў — дазваляюць самастойна выяўляць і выкарыстоўваць інфармацыю з мэтамі задавальнення патрэбнасцей, што маюць агульнанавуковае, адукацыйнае і практычнае значэнне. Часткай агульнай інфармацыйнай культуры з'яўляецца бібліятэчна-бібліяграфічная адукаванасць.

Пытанне аб неабходнасці азнаямлення студэнтаў з асновамі бібліяграфіі ўзнікла не сёння. Яшчэ ў сакавіку 1941 г. на старонках газеты "Известия" адзначалася, што ў ВНУ студэнт павінен авалодаць мінімумам бібліяграфічных ведаў, навучыцца правільна цытаваць крыніцы, складаць спіс літаратуры, умець карыстацца бібліяграфічнымі паказальнікамі. Бібліяграфічныя веды — гэта аснова, на якой будуецца ўся далейшая самастойная праца студэнтаў у ВНУ.

Гомельскаму дзяржаўнаму медыцынскаму інстытуту ўсяго 10 гадоў. Ён быў створаны ў 1991 г. у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па

прычыне недахопу медыцынскіх кадраў у чарнобыльскай зоне, да якой належыць і Гомельская вобласць.

У першыя гады станаўлення інстытута заняткі па бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці не праводзіліся. Гэта было абумоўлена тым, што бібліятэка, як і інстытут, пераадольвала вялікія цяжкасці, і ў першую чаргу па фарміраванні вучэбнай і навуковай літаратуры, па стварэнні даведачна-бібліяграфічнага апарату. Укараненне інфармацыйных тэхналогій у інстытуце і бібліятэцы садзейнічала інтэграцыі вучэбнага працэсу і дзейнасці бібліятэкі па бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі студэнцтва. Значная роля адводзілася курсу “Бібліятэчная справа”.

Заняткі з першакурснікамі пачалі праводзіцца з 1997г. За гэты час праграма і методыка курса змяняліся ў залежнасці ад магчымасцей раскладу, наяўнасці бібліёграфаў, набытага вопыту.

Спачатку заняткі былі факультатыўнымі, але ж потым сталі абавязковымі і былі ўключаны ў вучэбны план інстытута. У пачатку кожнага навучальнага года вучэбная частка інстытута інфармуе бібліятэку аб тым, дзе і калі пачынаюцца заняткі па курсе “Бібліятэчная справа”. Мэта курса — развіццё інтэлектуальных магчымасцей студэнтаў, неабходных для самаадукацыі на працягу ўсяго жыцця.

Студэнтам-першакурснікам прапануецца 4-гадзінная праграма: па 2 гадзіны лекцый і практычных заняткаў. Лекцыі чытаюцца ўсяму курсу, а практычныя заняткі праходзяць па групах у даведачна-бібліяграфічным аддзеле бібліятэкі. Трэба адзначыць, што недахоп вучэбных гадзін па курсе сур’ёзна адбіваецца на паўнаце набытых студэнтамі ведаў і навыкаў.

Тэма першай лекцыі — “Бібліятэка ГДМІ: структура, правілы выкарыстання. Культура работы з кнігай”. Асаблівая ўвага ў ёй надаецца характарыстыцы бібліятэкі, яе структуры, правам і абавязкам чытачоў. Таксама падрабязна расказваецца аб правілах вядзення канспектаў,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складання бібліяграфічных спісаў літаратуры, напісання рэфератаў.

Другая лекцыя — "Даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі ГДМІ". На ёй паведамляецца аб даведачна-бібліяграфічным фондзе бібліятэкі, каталогах, картатэках, пры гэтым падкрэсліваецца, што правілы размяшчэння картак у каталогах адзіныя для ўсіх бібліятэк дзяржавы. На гэтай жа лекцыі выкладаюцца асноўныя веды аб сістэмах класіфікацыі. Увага надаецца апісанню твораў друку.

Бібліёграфы імкнуцца зрабіць заняткі цікавымі, выкарыстоўваюць табліцы з прыкладамі апісання асноўных відаў дакументаў, узоры размяшчэння крыніц у бібліяграфічным спісе і інш. Лекцыі суправаджаюцца паказам усіх разглядаемых бібліяграфічных выданняў.

На практычных занятках першакурснікі набываюць навыкі работы з даведачна-бібліяграфічным апаратам бібліятэкі. Гэтыя заняткі дапамагаюць навучэнцам разабрацца ў сістэме каталогаў і картатэк, раскрываюць перад імі кніжнае багацце бібліятэкі.

Азнаямленне з літаратурай па медыцыне пачынаецца з выканання заданняў па авалоданні сістэматычным і прадметным каталогамі. Бібліёграфы акцэнтуюць увагу студэнтаў на алфавітна-прадметным паказальніку, а пры вывучэнні сістэмы картатэк — на картатэцы прац супрацоўнікаў і выкладчыкаў інстытута.

Заняткі на першым курсе дапамагаюць студэнтам набыць навыкі самастойнай работы з ДБА, прывучаюць іх сачыць за новай літаратурай.

Несумненна, якасць выкладання асноў бібліятэчна-бібліяграфіных ведаў патрабуе ўдасканалення: адсутнічае праграма, даволі слабае навукова-метадычнае забеспячэнне гэтага курса і інш. Але першыя крокі па засваенні матэрыялу курса "Бібліятэчная справа" абнадзейваюць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ